так как полк был выведен из города, С. И. Муравьев-Апостол повернул свой полк обратно к селу Трилесам, рассчитывая сделать бросок на Житомир. Но утром 3 января 1826 года при подходе к Трилесам, между деревнями Устиновкой и Ковалевкой, полк был встречен отрядом правительственных войск генерала Гейсмара. С. И. Муравьев-Апостол не велел солдатам стрелять, и повел их в атаку на орудия, полк был расстрелян картечью, а раненный в голову С. И. Муравьев-Апостол схвачен и в кандалах отправлен в Петербург [3, с. 174–178].

3 июня 1826 года состоялось открытие суда, он разделил всех участников тайного общества на 11 разрядов по силе их преступлений. Пять человек были поставлены вне разрядов и приговорены к смертной казни четвертованием, замененной повешением: Пестель, Рылеев, Сергей Муравьев-Апостол, Бестужев-Рюмин, Каховский. Также к смертной казны были приговорены члены общества, попавшие в первый разряд. Пятерых приговорили к четвертованию, тридцать одного – к отсечению головы. Но многие приговоренные были помилованы и вместо смерти они отправлялись на вечную каторгу.

**Причины поражения**: *во-первых*, малочисленность рядов декабристов; *во-вторых*, слабость декабристского движения заключалась в несколько любительском, не всегда серьезном отношении к делу (лишь немногие – Пестель, Рылеев, Муравьев-Апостол – с головой ушли в это дело и представляли всю его опасность); *в-третьих*, слабость заключалась в недостаточной конспирации, в результате чего и стало известно о деятельности общества императору; *в-четвертых*, не решительность командующих лиц, которая в большей степени и привела к поражению.

**Литература**

1 Ляшенко, Л. М. Декабристы. Новый взгляд / Л. М. Ляшенко. – М. : АСТ-ПРЕСС КНИГА, 2013. – 240 с.

2 Карташев, Б. И. Жизнь знаменитых людей. Пестель / Б. И. Карташев, В. Б. Муравьев. – М. : Молодая гвардия, 1958. – 336 с.

3 Записки и письма декабриста И. И. Горбачевского // Записки декабриста Горбачевского [ред. Б. Е. Сыроечковского]. – М. : Современные проблемы, 1925. – 398 с.

**УДК 930.85:394.21:006.95(47+57)«1917-1920»**

***Н. І. Казлова***

## ФАРМІРАВАННЕ САВЕЦКАГА СВЯТОЧНАГА КАЛЕНДАРА Ў 1917–1920-Х ГАДАХ

*Артыкул прысвечаны тэме фарміравання святочнага календара ў савецкай дзяржаве ў 1917–1920-х гг. У артыкуле прааналізавана стварэнне заканадаўчай базы, якая рэгламентавала ўвядзенне новых святаў. Таксама разгледжаны спосабы і формы правядзення рэвалюцыйных свят у першыя гады існавання савецкай улады. На аснове дадзенага даследавання аўтар прыходзіць да высновы, што тыя формы правядзення святаў, якія былі выпрацаваны ў 1917–1920-х гг. сталі асновай усталявання агульнадзяржаўных свят будучых гадоў.*

Важнай задачай у справе станаўлення савецкай святочнай культуры з’яўлялася ўвядзенне новага календара. Дадзены працэс быў накіраваны на ліквідацыю традыцый папярэдняй эпохі, на якія абапіраліся інстытуты самадзяржаўя і царквы, а таксама на стварэнне сістэмы рэвалюцыйных святаў. Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца

разгляд працэсу фарміравання савецкага святочнага календара ў 1917–1920-м гг. Тэрытарыяльныя рамкі даследавання адпавядаюць мяжы Савецкай дзяржавы 1917–1920-га гг. Храналагічныя рамкі абраны не выпадкова, бо менавіта на працягу 1917–1920-га гг. распрацоўвалася асноўнае заканадаўства, якое рэгламентавала ўвядзенне новых святаў. Таксама дадзены перыяд вызначальны тым, што менавіта ў гэты час выпрацоўваліся асноўныя метады і формы іх правядзення.

Першы этап станаўлення савецкай абраднасці працягваўся ад захопу ўлады бальшавікамі да сярэдзіны 1930-х гадоў. Дадзены перыяд быў насычаны пошукамі ідэйнага напаўнення і формаў новай рэвалюцыйнай сімволікі, эмблематыкі, атрыбутыкі, наватарствам у вобласці святочна-абрадавага мастацтва, выцясненнем старых, пераважна, рэлігійных святаў.

Так, першым законам, з прыняццем якога пачаўся доўгі працэс станаўлення “чырвонага” календара, з’яўляецца дэкрэт ад 29 кастрычніка 1917 г. “Пра васьмігадзінны працоўны дзень” паводле дзясятага артыкула якога: “У расклад свят, у якія не належыць працаваць, уключаюцца абавязкова ўсе нядзельныя і наступныя святочныя дні: 1 студзеня (Новы год), 6 студзеня (Хрышчэнне Господне), 27 лютага (Дзень звяржэння самадзяржаўя), 25 сакавіка (Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы), 1 мая (Дзень Інтэрнацыянала), 15 жніўня (Успенне Прасвятой Багародзіцы), 14 верасня (Узвядзенне Крыжа Госпадавага), 25 і 26 снежня (Раство Хрыстова), пятніца і субота Страснога тыдня, панядзелак і аўторак Велікоднага тыдня, дзень Ушэсця Госпадавага і другі дзень свята Сашэсця Св. Духа.” Таксама адзначалася, што дапускаецца занясенне ў расклад непрацоўных дзён, замест нядзельных, некаторых іншых рэлігійных свят адпаведна закону веры працоўных. Трэба адзначыць і такі момант, што згодна дадзенаму закону, святочныя дні такія як: Новы год, Хрышчэнне Гасподне, Успенне Прасвятой Багародзіцы, Узвядзенне Крыжа Госпадавага, Раство Хрыстова, субота Страснога тыдня і панядзелак Велікоднага тыдня маглі быць “заменныя іншымі вольнымі днямі” па жаданні большасці працоўных прадпрыемства ці гаспадаркі [1].

Усяго ж святочных дзён паводле дадзенага дэкрэта набіралася пятнаццаць, што адносна календара царскай Расіі было менш утройчы, аднак яшчэ існавалі рэлігійныя святы, якіх у першыя месяцы ўсталявання савецкай улады было больш за рэвалюцыйныя.

З пачатку 1918 г. у колах савецкага кіраўніцтва стала пытанне аб аддзяленні царквы ад дзяржавы, а таксама выцяснення рэлігійных святаў з побыту савецкага насельніцтва. Так, у адпаведнасці з дэкрэтам СНК РСФСР ад 20 студзеня 1918 г. “Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных аб’яднаннях”, царква была адлучана ад дзяржавы, абвяшчалася свабода веравызнання, а адпраўленне дзяржаўных і публічных грамадскіх мерапрыемстваў перастала насіць рэлігійнае суправаджэнне. Такім чынам, савецкая ўлада заканадаўча адмовілася ад сістэмы ўсіх рэлігійных абрадаў. Аднак варта адзначыць, што здзяйсненне рэлігійных абрадаў дапускалася з рэмаркай – калі “яны не будуць парушаць грамадскага парадку і не выклічуць парушэнне правоў грамадзян рэспублікі” [2, с. 373–374].

Гэтак жа, са зменай дзяржаўнага строю стала пытанне аб рэфармаванні сістэмы летазлічэння. Пытанне аб рэформе старога календара і фармаванне “чырвонага календара” было пастаўленае яшчэ 16 лістапада 1917 г. на паседжанні СНК. Урад вырашыў стварыць камісію, якая павінна была падрыхтаваць рашэнне дадзенага пытання. Рэформа была скіравана, перадусім, на ліквідацыю традыцый папярэдняй эпохі, на якія абапіраліся інстытуты самадзяржаўя і царквы, фармаванню сістэмы рэвалюцыйных свят. У Расійскай імперыі і ў першыя месяцы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі паўсюдна выкарыстоўваўся юліянскі каляндар, які адставаў ад грыгарыянскага на 13 дзён [3]. Пераход на грыгарыянскі каляндар пашыраў міжнароднае супрацоўніцтва, бо ён на той момант быў прыняты ў большасці краін. Абвясціўшы Новы год дзяржаўным святам, 24 студзеня 1918 года Савет Народных Камісараў прыняў Дэкрэт “Аб увядзенні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў Расійскай рэспубліцы заходнееўрапейскага календара": "З мэтай усталявання ў Расіі аднолькавага амаль з усімі культурнымі народамі вылічэння часу Савет Народных Камісараў пастанаўляе ўвесці па заканчэнні студзеня месяца гэтага года ў грамадзянскі ўжытак новы каляндар. У сілу гэтага: 1) Першы дзень пасля 31 студзеня гэтага года лічыць не 1-м лютага, а 14 лютага, другі дзень – лічыць 15-м і г. д.". Такім чынам, з-за пераходу на новы каляндар, перамясціліся і даты ранейшых свят, што спрыяла стварэнню новай святочнай сістэмы. Варта адзначыць, што праваслаўная царква варожа аднеслася да змены сістэмы летазлічэння (да цяперашняга часу працягвае карыстацца юліянскім календаром) [4, с. 404–405]. Першыя савецкія святы (да канчатковага афармлення святочнага календара іх адзначалася даволі шмат) былі наскрозь прасякнуты рэвалюцыйным настроем, характэрным для кожнай рэвалюцыі, унутраным уздымам і запалам, надзеяй на хуткія змены. Безумоўна, усё гэта запатрабавала і новых формаў, якія былі б зразумелыя кожнаму. Гэта было важна яшчэ і таму, што зараз апорай дзяржавы былі абвешчаны зусім іншыя сацыяльныя групы, у параўнанні з дарэвалюцыйным часам. А значыць, ранейшая святочная сімволіка была б не толькі неэфектыўная, але і шкодная, бо выклікала ў памяці асацыяцыі з царскім рэжымам. Невыпадкова адным з першых дэкрэтаў савецкай улады, які быў выдадзены за тыдзень да святкавання 1 Мая, стаў так званы "Дэкрэт аб помніках Рэспублікі" ад 12 красавіка 1918 г. Аднак было відавочным, што толькі знішчэннем старых знакаў змяніць сацыякультурную сітуацыю не атрымаецца. Практычна адразу паўстала патрэба не толькі ў стварэнні новага святочнага календара, які пасля рэвалюцыі складаўся "па ходзе падзей", але і ў тым, каб прыцягнуць лепшыя творчыя сілы для яго ідэалагічна-эстэтычнага афармлення [5, с. 27].

Ужо ў красавіку 1918 года пачалася падрыхтоўка да ўрачыстага святкавання першага савецкага рэвалюцыйнага свята – Дня Інтэрнацыянала. 8 красавіка 1918 года быў прыняты "Дэкрэт УЦВК аб сцягу Расійскай Рэспублікі". Ён узаконіў Чырвоны Сцяг з надпісам: "Расійская Сацыялістычная Федэратыўная Савецкая Рэспубліка". Перад святкаваннем, а менавіта 26 красавіка, быў выдадзены "Зварот ВЦВК да ўсіх губернскіх, павятовых, валасных Саветаў аб прыняцці мер па арганізацыі першамайскага свята і пра яго лозунгі" [3].

1 Мая 1918 года па ўсёй краіне адбыліся шматтысячныя мітынгі, дэманстрацыі і шэсці, на якіх выступілі вядомыя дзеячы рэвалюцыі, партыйныя функцыянеры, матросы, рабочыя і салдаты. Гарады і вёскі былі ўпрыгожаны тысячамі сцягоў, плакатаў з рэвалюцыйнымі лозунгамі [6, с. 45]. Так, арганізатар і ўдзельнік першамайскага свята А. В. Луначарскі пакінуў наступныя ўспаміны: "Грукаталі салюты з Петрапаўлаўскай крэпасці. Так, святкаванне Першага Мая было афіцыйным. Яго святкавала дзяржава. Моц дзяржавы адлюстроўвалася шмат у чым. Але ці не паказальная сама ідэя, што дзяржава, якая дагэтуль была нашым лютым ворагам, зараз – наша і святкуе Першае Мая, як сваё найвялікшае свята? Але, паверце, калі б гэта свята было толькі афіцыйным, – нічога, апроч холаду і пустэчы, не атрымалася б з яго. Не, народныя масы, Чырвоны флот, Чырвоная армія – увесь працоўны свет уліў у яго свае сілы. Таму мы можам сказаць, што ніколі яшчэ гэтае свята не набывала такія прыгожыя формы!" [7, з. 83].

Наступным рэвалюцыйным святам, якое шырока адзначалася, стала гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Падрыхтоўка да святкавання таксама пачалася загадзя. 18 верасня 1918 года выйшла пастанова ВЦВК "Аб дні святкавання гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі". У адпаведнасці з якой святкаванне па новым стылі павінна было адбыцца 7 лістапада. На правядзенне урачыстасцяў былі вылучаны значныя грашовыя сродкі. 25 верасня 1918 года адбылося паседжанне Савета калегіі аддзела народнай асветы. На паседжанні была абрана камісія для выпрацоўкі плана правядзення свята. Камісія прыйшла да заключэння, што свята не павінна насіць афіцыйнага характару, як 1 Мая і мець глыбокі ўнутраны сэнс. Было вырашана, што

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

свята павінна працягвацца тры дня. Камісія прапанавала пачаць яго адзначэнне лекцыямі па раёнах для шырокіх мас насельніцтва; на гэтых лекцыях масам неабходна было тлумачыць сэнс і значэнне падзей, якім яно было прысвечана. У гэты ж дзень павінны былі адкрыцца абеліскі у гонар рэвалюцыі. На другі дзень чыталіся вершы, урыўкі з мастацкіх твораў, увечары павінны былі выступаць тэатральныя калектывы з тэматычнымі пастаноўкамі. Трэці дзень павінен быў прайсці ў маніфестацыях і "ўсенароднай радасці" [3].

Усе наступныя святкаванні Першамая і чарговых гадавін Кастрычніка былі звязаныя з выкарыстаннем тых сцэнарыяў, якія былі выпрацаваны ўладай у першы год свайго існавання. Так, напрыклад, у 1919 г. і ў наступныя гады сталі выпускацца зборнікі сцэнарыяў, якія змяшчалі інфармацыю аб свяце і яго гісторыі, рэкамендацыі па яго правядзенню.

У новай дзяржаве пачаўся працэс укаранення ў побыт савецкага грамадства новых "рэвалюцыйных свят". Так, у адпаведнасці з правіламі СНК РСФСР "Пра штотыднёвы адпачынак і святочных днях" ад 2 снежня 1918 г., змешчаных у Кодэксе законаў пра працу забаранялася працаваць "у наступныя святочныя дні, прысвечаныя ўспамінам аб гістарычных і грамадскіх падзеях": Новы год (1 студзеня), Дзень 9 студзеня 1905 г. (22 студзеня), Дзень звяржэння самадзяржаўя (12 сакавіка), Дзень Парыжскай Камуны (18 сакавіка), Дзень Інтэрнацыянала (1 мая), Дзень Пралетарскай рэвалюцыі (7 лістапада). Такім чынам, рэвалюцыйныя святы былі ўзаконены. Гэтак жа гаварылася пра так званыя "асобыя" дні адпачынку, якія не прадугледжвалі аплаты. Мясцовыя ўлады са згоды Народнага Камісарыята працы маглі ўсталёўваць такія дні, але не больш дзесяці ў год, у адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі і святамі [8].

Святочная культура вельмі хутка стала часткай сістэмы савецкай дзяржаўнасці. Так, А. В. Луначарскі пісаў: "з'яўляецца зусім бясспрэчным, што галоўнай мастацкай спадчынай рэвалюцыі заўсёды былі і будуць народныя святы" [9, с. 359].

Такім чынам, у разглядаемы перыяд ішоў працэс станаўлення святочнай культуры. Распрацоўвалася і прымалася заканадаўства, якое ўсталёўвала сістэму рэвалюцыйных святаў. Выпрацоўваліся асноўныя метады і формы іх правядзення. Трэба адзначыць, што калі святы, якія праводзіліся ў 1918–1920-м гг. адрозніваліся меншай ступенню рэгламентацыі з боку дзяржавы і большай ступенню мясцовай ініцыятывы, то з умацаваннем савецкай улады пасля Грамадзянскай войны, святы ператвараліся ў звышцэнтралізаваныя і рэгламентаваныя да дробязяў. Але нават ва ўмовах Грамадзянскай вайны і эканамічнага крызісу ўлада імкнулася да падтрымання ў свядомасці людзей ідэі трываласці і сілы дзяржавы дыктатуры пралетарыяту.

**Літаратура**

1 О восьмичасовом рабочем дне: декрет СНК РСФСР от 29.10.1917 [Электронный ресурс] // СУ РСФСР. – 1917. – №1. – Режим доступа: http://lawrussia.ru/texts/legal_861/doc861a389x473.htm. – Дата доступа: 23. 02. 2016.

2 О свободе совести, церковных и религиозных обществах: декрет СНК РСФСР от 20 января 1918 г. // Декреты Советской власти : в 5 т. – М.: Гос. изд-во полит. литературы, – 1957. – Т. 1. – С. 373–374.

3 Шаповалов, С. Н. Советские революционные праздники в 1918–1920-е гг. [Электронный ресурс] / С. Н. Шапавалов // Теория и практика общественного развития. – Режим доступа: http://teoria-practica.ru/-1-2010/shapovalov.pdf. – Дата доступа: 03.03.2016.

4 О введении в Российской республике западноевропейского календаря: декрет СНК РСФСР от 24 января 1918 г. // Декреты советской власти : в 5 т. – М.: Гос. изд-во полит. литературы, – 1957. – Т. 1. – С. 404–405.

5 Свиридова, Е. Г Государственная политика СССР в сфере праздничной культуры (20–40-е гг.) / Е. Г. Свиридова // Время науки. – 2014. – № 2. – С. 24–33.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6 Шалаева, Н. В. Становление советской праздничной культуры и особенности ее восприятия в общественном сознании 1917–1920-х гг. / Н. В. Шалаева // Известия Саратовского университета. – 2013. – № 4. – С. 44–48.
7 Луначарский, А. В. Первое мая 1918 года (Эскизы из записной книжки) / А. В. Луначарский // О массовых празднествах, эстраде и цирке: сборник. – М.: Искусство, – 1981. – С. 80–83.
8 Кодекс законов о труде РСФСР 1918 года : прилож. из учеб. пособия И. Я. Киселева «Трудовое право России» / И. Я. Киселев. – М., 2001. – 20 с.
9 Луначарский, А. В. О народных празднествах / А. В. Луначарский // О массовых празднествах, эстраде и цирке: сборник. – М.: Искусство, – 1981. – С. 359–362.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**УДК 94(476)«19»:394(476.2-37Гомель-22Р.Маримонова)**

***А. А. Калоша***

## ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ 20 В. В ОТРАЖЕНИИ ЖИЗНИ СЕМЕЙ ДЕРЕВНИ РУДНЯ МАРИМОНОВА ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

*Статья посвящена значимым событиям истории Беларуси, хронологические рамки которой охватывают 20 в. Материалами послужили оригинальные данные, выявленные автором в процессе исследования в 2015–2016 гг. истории отдельных семей. Показано отражение отечественной истории в судьбах представителей семейных коллективов (родов) деревни Рудня Маримонова Гомельского района.*

Семью можно представить как блок памяти, вбирающий в себя политические, экономические и культурные явления, происходящие в государстве на определенном историческом этапе. История государства, этнокультурное развитие белорусов, своеобразие преломления жизни страны в определенном регионе в полной мере отражаются на судьбах представителей того или иного рода. Следовательно, через восстановление истории семьи в поколениях можно создать уникальную источниковедческую базу и проследить, как на микроуровне проявились значимые исторические перемены в обществе. На основе реконструированной жизни рода возможно более объективно и глубоко проанализировать преобразования в системе государственного устройства, где члены семейного коллектива выступают в роли действующих лиц, показать военно-исторический пласт посредством изучения биографии отдельных членов семьи – участников военных сражений, представить поступательный ход культурных перемен, обращаясь к таким аспектам, которые связаны с приобщением к культурным традициям поколений семьи и выработкой своего собственного опыта инкультурации в отличающихся условиях и пр. Актуальность темы усиливается в связи с сокращением рядов старших представителей семей, которые осведомлены о жизни семей в отдаленном для нас прошлом, что исключительно важно для восприятия и понимания отечественной истории современниками.

Историография темы в разных ее сюжетных линиях представлена неодинаково полно. Если по истории Беларуси (экономика, военная история, политической и социальное развитие, конфессиональный аспект, культурные традиции) имеется обширный спектр научной литературы, достаточно четко разработана краеведческая составляющая, то по истории собственно отдельных семей в разных сельских населенных пунктах Гомельщины информация не только не исследована, не опубликована с комментариями, но, к сожалению, даже не выявлена и не зафиксирована. Это обстоятельство придает новизну теме и делает востребованными результаты данного исследования в дальнейшей работе по патриотическому воспитанию и популяризации истории своего края. В числе